21. Шаройко, А. М. Жанрава-стылявая эвалюцыя беларускага гістарычнага фільма : аўтарэф. дыс.… канд. мастацтвазн. : 17.00.09 / А.М. Шаройка. – Мінск, 2011. – 24 с.

22. Шергова, К.А. Эволюция жанров в документальном телевизионном кино : дис. ... канд. искусствовед. : 17.00.03 / К. А. Шергова. – М. : 2004. – 192 с.

**Рошчына М.Ю., Лапаціна Н.Ц.,**
**Лісоўская Я.А.,** студэнты
Навуковы кіраўнік – Байко А.П.

## МОДНЫ ПАКАЗ ЯК ІНКЛЮЗІЎНАЯ ТЭХНАЛОГІЯ Ў ПРАЦЫ З ДЗЕЦЬМІ-ІНВАЛІДАМІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На працягу XX стагоддзя тройчы адбывалася трансфармацыя канцэпцый стаўлення да дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя і разумовага развіцця: да сярэдзіны 60-х гадоў назіралася сегрэгацыя – медыцынская мадэль; да сярэдзіны 80-х гадоў адбыўся пераход да інтэграцыі – мадэль нармалізацыі; у цяперашні час рэалізуецца сацыяльная мадэль – інклюзія [7, с. 99]. Пры гэтым сегрэгацыя разглядала асаблівых дзяцей як хворых, якім неабходны медыцынскі догляд і лячэнне і лепш за ўсё гэта ажыццяўляць у спецыялізаваных установах. Інтэграцыя ж ужо разглядалася як працэс асіміляцыі, які патрабуе ад дзіцяці прымаць нормы, характэрныя для дамінуючай культуры, і прытрымлівацца іх у сваіх паводзінах. Аднак сёння за мяжой рэалізуецца мадэль, у адпаведнасці з якой дзіцё не абавязана быць гатовым для таго, каб навучацца ў школе, альбо далучацца да культуры, – вялікая ўвага надаецца адаптацыі асяроддзя да яго магчымасцей, развіццю здольнасцей, якія могуць быць запатрабаваныя там, дзе ён жыве, вучыцца і працуе. Новы погляд на месца асаблівага дзіцяці ў грамадстве больш за ўсё адлюстроўвае тэрмін уключэнне – інклюзія. Інклюзія – гэта не прыстасаванне

інваліда, а адаптацыя грамадства. Інклюзія (ад inclusion - уключэнне) – працэс павелічэння ступені ўдзелу ўсіх грамадзян у жыцці соцыума, і ў першую чаргу тых, што маюць цяжкасці ў развіцці.

У Рэспубліцы Беларусь на працягу пяці гадоў пры падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Пасольства Каралеўства Швецыі, культурнай арганізацыі ShareMusic & PerformingArts рэалізуюцца розныя праекты на аснове інклюзіўных тэхналогій: ―Інклюзіўная Беларусь"; ―Музей для ўсіх. Інклюзіўныя культурныя праекты: шведскі вопыт"; праект ―Інклюзіўная сацыяльная прастора карысна ўсім" і інш. Як бачна яны існуюць па ініцыятыве грамадскіх альбо рэлігійных суполак і арганізацый. Тлумачэннем з'яўляецца тое, што такая сітуацыя склалася гістарычна, калі ў асноўным доглядам інвалідаў займаліся дабрачынцы і царква.

Тэма тэзісаў абумоўлівае неабходнасць разгляду яшчэ аднаго феномену – модных паказаў, якія становяцца арганізаванай рэальнасцю, актыўна запаўняючы сацыяльна-культурнае асяроддзе, у якім знаходзіцца сучасны чалавек. Дэфіле, тэатральнае шоу, перфоманс, энвайронмэнт, акцыя, класічная дэманстрацыя адзення, канцэптуальны паказ - гэта не поўны пералік формаў паказаў мод, якія характарызуюць новыя вобразныя з'явы і модныя сэнсы, адлюстроўваюць светаадчуванне і светапогляд дызайнера. Як падкрэслівае даследчыца Э.В. Васільева[6], кожны дызайнер спрабуе знайсці свой набор знакаў ці сукупнасць сімвалаў для візуальнага паведамлення пэўнай інфармацыі публіцы. Сучасныя модныя паказы адрозніваюць падыходы ў пастаноўках: ад знешняй яркасці формаў касцюма да філасофскай глыбіні падтэксту сэнсаў і вобразаў моды, ад асаблівай гармоніі цела чалавека і касцюма да трансфармацыі навакольнага асяроддзя, мінімалістычнае рашэнне пастаноўкі паказу кампенсуецца складанасцю сілуэтаў моднай вопраткі.

Яскравым прыкладам ―тэхналогіі ўключэння" з'яўляецца - інклюзіўны паказ мод. Паказ мод, як інклюзіўная тэхналогія рыхтуецца праз працэс творчага ўзаемадзеяння з людзьмі з абмежаванымі магчымасцямі з мэтай дэманстрацыі новай калекцыі адзення. У такім паказе мод удзельнічаюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асаблівыя мадэлі – людзі з рознымі псіхафізічнымі асаблівасцямі (зроку, слыху, ДЦП і г.д.). У СМІ зафіксавана, што ўпачатку 2016 года ў Мінску пад патранажам прадстаўніцтва Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) у межах 6-га паказу total look «Мода Італіі» беларускія дзеці і маладыя людзі з асаблівасцямі развіцця прадставілі модную калекцыю адзення, якую спецыяльна для іх распрацавалі італьянскія дызайнеры; а ў канцы таго ж года адбыўся інклюзіўны паказ мод з удзелам прафесійных мадэляў і ―асаблівых" дзяцей у час Belarus Fashion Week (BFW), калі кожнае дзіцё на подыуме прадставіла пэўнага персанажа аповесці «Маленькі прынц» Антуана дэ Сэнт-Экзюперы ў вопратцы ад дызайнера Таццяны Яфрэмавай [7].

Гэта ўсё адбывалася ў нашай краіне, але раней – у сакавіку 2014 на Тыднях моды ў Маскве (міжнародны праект ―Бяз межаў куцюр") на подыум выйшла першая топ-мадэль з ДЦП у Расіі і Беларусі – Ангеліна Уэльская (дарэчы выпускніца факультэта завочнага навучання БДУКМ), і адразу атрымала статус прафесійнай мадэлі. А ўжо ў 2017 годзе Ангеліна Уэльская разам з Аляксандрай Чычыкавай ад Беларусі ўдзельнічалі ў конкурсе «Міс свету ў інвалідная калясцы», на якім Аляксандра заваявала карону. Пры гэтым у сваім інтэрв'ю [0] Міс свету адзначала, што ў звычайным жыцці ёй не хапае беларускага брэндавага адзення, якое было распрацавана з улікам асаблівых патрэб людзей на калясках. Падкрэслім, што вясной 2017 года адбылася прэзентацыя, fashion-паказ новай калекцыі, створанай пераможцам конкурсу сацыяльных праектаў Social Weekend - дызайнерам Кацярынай Цікота, для інвалідаў-калясачнікаў з улікам фізіялагічных асаблівасцей людзей з абмежаванымі магчымасцямі. У планах К. Цікоты ўкараніць спецыялізаваны асартымент з максімальным дапаўненнем яго камфортнымі і зручнымі дэталямі, а таксама прыцягнення здаровых людзей да куплі адзення для інвалідаў-калясачнікаў.

Гістарычна-практычны аналіз пераканаў у наяўнасці неабходнага падмурка і досведу ўключэння ―асаблівых" дзетак у модныя паказы. Да таго ж мы, як група валанцёраў, якія кожны тыдзень ездзілі ў школы-інтэрнаты,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праводзіць з дзецьмі майстар-класы і іншыя разнастайныя сацыяльна-культурныя мерапрыемствы, а таксама ўдзельнічалі ў розных акцыях, каб знайсці сродкі ажыццяўляць гэта часцей і лепш, – загарэліся ідэяй дапамагчы асаблівым дзецям прыдбаць зручнае адзенне ад беларускіх дызайнераў. Адзенне, якое перадасць любоў і будзе натхняць на творчасць! Такім чынам мы падтрымалі ініцыятыву валанцёрскага клуба ―СЛОН‖ БДУКМ па арганізацыі дабрачыннага моднага паказу адзення, створанага дызайнерамі з улікам асаблівасцей дзяцей-інвалідаў, мадэлямі ў якім выступілі выхаванцы дапаможных і спецыяльных школ-інтэрнатаў, а іх выхад на подыум суправаджалі творчыя нумары артыстаў беларускай эстрады. Адпаведна асаблівая атмасфера нашага дабрачыннага моднага паказу стваралася аб'яднаннем і ўзаемадзеяннем многіх сродкаў мастацкай выразнасці, індывідуальным падыходам рэжысёра і дызайнераў адзення да пастановак моднага дэфіле, выбарам песенных кампазіцый і артыстаў, з узгадненнем дызайнерскіх калекцый і выступленняў. Модны паказ прадэманстраваў, што «асаблівыя» дзеці могуць нароўні з іншымі выступаць на подыуме, выконваць ролю мадэляў і пазіраваць фатографам. 4 сакавіка 2018 года на сцэне НАДТ імя М. Горкага прайшоў інклюзіўны паказ мод «Першае каханне». Арганізатарамі дабрачыннага паказу модных убораў для дзяцей з асаблівасцямі ў развіцці выступілі Фонд імя прападобнай Ефрасінні Полацкай, установа адукацыі ―Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў‖ і дызайнер Анастасія Фальковіч. Дзеці з інваліднасцю з Маладзечна, Івянца, Вілейкі, Чэхаўшчыны дэманстравалі на сцэне вопратку, якую дызайнеры спецыяльна пашылі для кожнага дзіцяці з улікам асаблівасцей развіцця мадэляў і падаравалі ім пасля паказу. Так на паказе былі прадстаўлены, напраклад, сукенкі расшытыя бісерам на шрыфце Брайля для дзетак з слабым зрокам і майкі з малюнкамі на мове жэстаў для глухіх дзяцей.

Шматмесячная праца дызайнераў, рэжысёраў, харэографаў і педагогаў на месцах у інтэрнатах, пошукі спонсараў і ўзаемадзеянне з карэспандэнтамі, прымеркі і рэпетыцыі, – забяспечылі высокі ўзровень мерапрыемства і моцны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грамадскі водгук (больш за 20 публікацый у розных СМІ). Але галоўны інклюзійны вынік – дзеці-інваліды адчулі сябе сапраўднымі мадэлямі, якія выходзяць на сцэну-подыум у брэндавым адзенні пад шкал апладысментаў і сваім выступленнем узмацняюць выкананне песень вядомых спевакоў.

Такім чынам, інклюзіўны паказ мод у галіне сацыяльных інавацый - гэта спосаб узаемадзеяння людзей, які сцірае межы зносін праз сумесную творчасць дзяцей з абмежаваным здароўем і здаровымі людзьмі. На подыуме інклюзія становіцца рэабілітацыйным працэсам, у якім выкарыстоўваюцца рухі і пластыка для паляпшэння псіхалагічнага, фізічнага і творчага стану дзяцей-інвалідаў. Сёння, калі спецыфіка сучаснага развіцця абумоўлена стварэннем новых грамадскіх установак і новай сацыяльнай і культурнай палітыкай, выкарыстанне новых форм працы з дзецьмі-інвалідамі набывае ўсё больш выразныя структурныя абрысы як від прафесійнай, навуковай і адукацыйнай дзейнасці. Сучасныя арганізацыі і ўстановы, якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць у сацыяльна-культурнай сферы, павінны адаптавацца да зменлівых рэалій навакольнага свету, вылучаць і адаптаваць інклюзіўныя тэхналогіі ў грамадства. Арганізатары інклюзіўных форм, у тым ліку ―асаблівых" модных паказаў не проста дапамагаюць такім людзям знайсці сябе ў грамадстве, але і даказваюцым самім, што яны валодаюць вялікімі магчымасцямі.

У рамках дадзенага артыкула мы распачалі спробу канкрэтызаваць паняцце інклюзіўнай тэхналогіі і прадставіць сваё бачанне і разуменне яе ў рэалізацыі цалкам валанцёрскага праекту – інклюзіўнага моднага паказу.

---

5. Белоруска Александра Чичикова стала ―Мисс Мира-2017 на инвалидной коляске" [Электронный ресурс] – Режим доступа : https://ej.by/news/lifestyle/2017/10/08.html. – Дата доступа : 10.10.2017

6. Васильева, Э.В. Модный показ как система кодов современной культуры / Э.В. Васильева //Вестник Челябинской государственной академии культуры и искусств. – 2015. – № 2 (42). – С. 98-105.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. Главные женские новости [Электронный ресурс] – Режим доступа : https://lady.tut.by/news/style/519239.html. – Дата доступа : 10.10.2017

8. Психолого-педагогическое сопровождение детей особой заботы: коллективная монография / отв. ред. А.Ю. Нагорнова. – Ульяновск : Зебра, 2017. – 125 с.

**Рубец В.В.,** студэнт

Навуковы кіраўнік – Пісарэнка А.М.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЧЫСЦІНЯ МАЎЛЕННЯ СУЧАСНАГА СТУДЭНЦТВА

**Чысціня маўлення як камунікатыўная якасць** цесна звязана са стылістычнымі і этычнымі нормамі, якія дапамагаюць берагчы мову ад засмечвання, кантралююць ўжыванне нелітаратурных моўных элементаў і некаторых літаратурных, унармаваных, якія знаходзяцца па-за межамі мовы адных функцыянальных стыляў, але адлюстроўваюць маўленчую адметнасць іншых. Лінгвісты прапаноўваюць размяжоўваць дзве крыніцы засмечвання.

Асноўную шкоду чысціні маўлення, на іх думку, наносяць менавіта нелітаратурныя моўныя элементы: дыялектызмы; жарганізмы; прастамоўі; фразеалагізмы з прастамоўнай афарбоўкай; некаторыя неалагізмы.

Гэтыя нелітаратурныя лексемы парушаюць чысціню маўлення, якая з‘яўляецца адной з самых важных камунікатыўных якасцей, а таксама абцяжарваюць працэс зносін з лінгвістычнага, этычнага і маральнага боку. Мова, перасыпаная словамі з незразумелай семантыкай, са зніжанай стылістычнай афарбоўкай, блакіруе інфармацыйную і эмацыянальную яе засваяльнасць субяседнікам.

Негатыўны эфект маўленню могуць надаваць і літаратурныя моўныя элементы: канцылярызмы і штампы; запазычаныя словы; вузкаўжывальныя прафесіяналізмы.